
Падтрымай "Вясну" на PATREON

Жодзінскі гарвыбаркам зарэгістраваў усяго 6 ініцыятыўных груп

14.01.2014 **Тэгі**: выбары-2014



Назіральнікі адзначаюць скрайне пасіўную сітуацыю з падачай заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатамі ў дэпутаты Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў 27 склікання.

Працэс рэгістрацыі заяў вылучэнцаў у кандыдаты на мясцовых выбарах будзе праходзіць да 16 студзеня, але на другім паседжанні гарвыбаркаму ў Жодзіне 13 студзеня было зарэгістравана ўсяго 6 ініцыятыўных груп па 6 заявах. Пры гэтым у горадзе сфармавана 36 выбарчых акругаў на 23 выбарчых участках.

На другое паседжанне Гарадской выбарчай камісіі ў Жодзіне назіральніка **Аляксея Лапіцкага** запрасіла па тэлефоне сакратарка камісіі, начальніца арганізацыйна-кадравага аддзелу гарвыканкама **Таццяна Краўцэвіч**.

На паседжанні прысутнічала 11 сябраў камісіі (на другім пытанні да працы далучыўся яшчэ адзін, дванаццаты). Вёў паседжанне старшыня камісіі С**яргей Афанасенкаў.**

Удзельнікі адзінагалосна прынялі і ўхвалілі:

1) аб рэгістрацыі шасці ініцыятыўных груп па зборы подпісаў пры вылучэнні кандыдатамі ў дэпутаты Жодзінскага гарадзкога Савета дэпутатаў:

- ініцыятыўная група №1 **Алены Ахрамовіч** (СШ№2, 9 чал.) па Цэнтральнай заводзкай акрузе №10;

- ініцыятыўная група №2 **Сяргея Семянца** (Тэрмагальванічны цэх ААТ "БелАЗ", 4 чал.) па Цэнтральнай акрузе №11;

- ініцыятыўная група №3 **Аляксандра Кляшчонка** (Ветэрынарная гарадская станцыя, 6 чал.) па Фрунзенскай Зарэчанскай акрузе №6;

- ініцыятыўная група №4 **Міхаіла Бараноўскага** (Інстытуту жывёлагадоўлі, 6 чал.) па Фрунзенскай акрузе №5;

- ініцыятыўная група №5 **Юрыя Марэцкага** (вайсковы камісар Вайсковага камісарыята Смалявіцкага раёну и горада Жодзіна, 7 чал.) па Новай акрузе №20;

- ініцыятыўная група №6 **Анжалікі Шэршань** (ДЮСШ па веславанні на байдарках і каноэ, 6 чал.) па Купрыянаўскай акрузе №1.

2) узгадненне прадстаўленых Жодзінскім выканкамам прапановаў па ўтварэнні ўчасткаў для галасавання на выбарах дэпутатаў Жодзінскай гарадской рады - утвораны 23 участкі;

3) прапановы па зацвярджэнні графіку дзяжурстваў у памяшканні камісіі (пасля паступлення прапановаў ад 2-х удзельнікаў было вырашана зрабіць графік **Тацянай Краўцэвіч** у працоўным парадку).

Напрыканцы паседжання кіраўніцтва камісіі адмовіла назіральніку **Аляксею Лапіцкаму** ў магчымасці азнаёміцца з паступіўшымі и разгледжанымі на паседжанні дакументамі, у прыватнасці - з прадстаўленнем выканкаму аб выбарчых гарадскіх участках.


Старшыня камісіі **Сяргей Афанасенкаў** запэўніў прысутных у тым, што назіральнікі могуць азнаёміцца толькі з дакумэнтамі, якія ўжо апублікаваныя ў афіцыйным друку.

У выніку Лапіцкі змог азнаёміцца з дакументамі пасля паседжання, атрымаўшы іх ад сакратара **Таццяны Краўцэвіч**.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Твитнуть






СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Мужа і жонку з Дзяржынска асудзілі па групавым фотаздымку з акцыі пратэсту

Апазналі па відэа з дзіцём на руках. Экс-следчага і ягоную жонку асудзілі за ўдзел у акцыях пратэсту

У Мінску адразу пяці чалавекам прызначылі па году калоніі за ўдзел у акцыях пратэсту

Жыхарку Фаніпаля асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту з белай стужкай




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Мой статус быў "злосны парушальнік". Леанід Судаленка — пра зняволенне, ад'езд з Беларусі і салідарнасць

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява беларускіх праваабарончых арганізацый у сувязі з прызнаннем "Вясны" экстрэмісцкім фармаваннем

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жыхара Смалявіцкага раёна за ўдзел у нядзельным маршы пратэсту асудзілі да "хатняй хіміі"

"Маючы пры сабе атрыбутыку – сцяг бел-чырвона-белага колеру, выказваў свае грамадска-палітычныя погляды"

Супрацоўніцу БНТУ асудзілі па "народным" артыкуле за ўдзел у акцыях пратэсту

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Стаў вядомы прысуд вядомаму сталічнаму самелье Аляксандру Кульбачку

За абразу Лукашэнкі ў Мінску асудзілі кіроўцу


Берасцейскага пенсіянера асудзілі за абразу Лукашэнкі і супрацоўніка міліцыі (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

